**За нашу і вашу свабоду**

Рэзалюцыя, прынятая ўдзельнікамі *Дзён памяці Натальлі Гарбанеўскай*.

Мы, сябры і калегі Натальлі Гарбанеўскай, у другі раз сабраліся ва Ўроцлаве дзеля таго, каб ушанаваць памяць выдатнай грамадзянкі Эўропы, абаронцы правоў чалавека, антыкамуністкі, паэткі й непахіснай прыхільніцы польска-расійскага сяброўства, асобы, што 25 жніўня 1968 году выйшла на Чырвоную плошчу, каб выразіць свой пратэст супраць савецкай агрэсіі ў Празе. У гэты дзень выразна і моцна прагучаў голас свабоднай Расіі, ня згоднай трываць хлусьню рэжыму.

Сёньня, праз паўстагодзьдзя пасьля тых падзеяў і 26 гадоў пасьля разбурэньня Бэрлінскага мура, сьвет не зрабіўся бясьпечнейшы. Савецкая імпэрыя зьмяніла афарбоўку, але не зьмяніла сваёй сутнасьці.

Мы, удзельнікі міжнароднай канфэрэнцыі *Дні памяці Натальлі Гарбанеўскай*, выражаем сваю трывогу й пратэст супраць новых пагрозаў для чалавецтва.

Наш асаблівы неспакой выклікае разьвіцьцё сытуацыі ва Ўкраіне.
Дзеяньні расійскага рэжыму – гэта ня толькі агрэсія супраць Украіны, але й пагроза для самой Расіі, пагроза ўсяму сьвету.

Мы зьвяртаемся да ўрадаў і грамадзянаў усяго сьвету: не забывайце пра Ўкраіну. Спыніце расійскую агрэсію.

Сёньня зноў, як і напярэдадні II сусьветнай вайны, сьвет у небясьпецы; сёньня зноў пазбаўляюць свабоды тых, хто змагаецца за свабоду. Гэта пагроза для ўсіх нас.

За вашу і нашу свабоду!

Уроцлаў, 28.XI.2015